# Калейдаскоп

кастрычнік 2022

**Школьная газета №2 (42)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**кастрычнік 2022**

## Мова матчына

**Мова матчына!**
**Гучная, звонкая,**

**Ты ўвайшла ў маё сэрца даўно,**
**То шапочаш бярозкаю тонкаю,**
**То шуміш залатой збажынай.**

**То звініш жаўруковаю песняю**
**Над абсягам прыціхлых палёў,**
**Ручаінамі звоніш прадвеснімі,**
**То курлычаш жальбой жураўлёў.**

**Набіралася моцы стагоддзямі,**
**Прыгажэла, мужнела, расла.**
**Не гублялі цябе, не знаходзілі –**
**Ты заўжды ў нашых сэрцах была** ***(У. Ляпёшкін).***



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**кастрычнік 2022**

Дзясяты месяц году ў грэгарыянскім календары, другі месяц восені, мае 31 дзень. Назва паходзіць ад слова «кастрыца» (кастра): нашы продкі ў гэты час часалі, трапалі лён і каноплі, з якіх ападала шмат кастры. Усе святкаванні гэтай пары— нібы кароткія перадышкі ва ўмовах падрыхтоўкі да зімы. Асноўнае свята ў кастрычніку — Пакровы. Сяляне стараліся да яго закончыць палявыя работы. Пакровы заўсёды чакалі, бо тады было менш работы.



З **сёмага па чатырнаццатага кастрычніка** — тыдзень перад святам Пакрова, «бабіна лета» . Звычайна на Беларусі ў гэтыя дні ўсталёўваецца прыгожае надвор’е, і пагоднасць дзён увасабляе такім чынам шчасце «бабуль».

**9 кастрычніка**. Іван Багаслоў (Багуслаў). Гэты дзень – мяжа ўсім шанаванням дбайнага земляроба, бо зямля атрымлівае за свае дары нябеснае благаславенне на спакой да самае вясны. Няўпраўнасць гаспадара дакаралася ў народзе: «Хто не дасее да Івана Багаслова, той не варты добрага слова». Галоўнай жа прыкметай дня быў пачатак восеньскіх вяселляў – сваццi i жанiхi дамаўляліся пра дзяўчат на выданні, што гучыць у прыказцы: «Іван Багуслаў дружкі разаслаў».

**10 кастрычніка.** Савацей, Калістрат, Марк, Арыстарх, Ігнат. У імені Францішак з каталіцкага календара шукалі асацыяцый з апусцелым на гэтую пару полем, што і адзначана ў вуснай народнай творчасці: «На святога Францішка шукае зярнят у полі мышка».

**14 кастрычніка.** Пакроў (Пакравы, Пакрова). Само слова праваслаўная царква тлумачыла літаральна: пакроў (пакрывала) Божай Маці. У народнай жа трактоўцы гэта паняцце атрымлівала куды больш шырокі сэнс, ахопліваючы самыя розныя прыкметы прыроды: «Святы Пакроў накрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам», «…рыбу луской, дрэва карой, птаху пяром, дзеўку чапцом»; «Святэй Пакроў стагі пакрыў: першы стажок драніčкамі, другі стажок саломкаю, трэці стажок белым снегам». Гаварылі, што зіма закрывае лета, а Бог пячатае зямлю пасля Пакрова, і да вясны ніхто не можа знайсці скарбаў. На Віцебшчыне існаваў звычай пячы на свята пірог і абыходзіць з ім усе гаспадарчыя будыніны, прыкладаючы да кожнае страхі, каб буры, што пачынаюцца ад Пакрова, не разбуралі стрэхі. Прыгадаем, што абыходзілі з хлебам палеткі вясною і менавіта на Юр’я, калі зямля «адмыкаецца» ад сіл, якія скавалі яе.

# Народныя традыцыі

Калейдаскоп
кастрычнік 2022



**14 кастрычніка.** Пакроў (Пакравы, Пакрова). Юр'е і Пакроў яднаюцца між сабою тым, што з першым звязаны выган жывёлы пасля зімы, а з другім — пачатак зімавання скаціны ў хляве («Пакрова — зарыкала ў хляве карова»). На Пакроў трэба было закласці ў яслі корму, нават калі жывёла была сытая: «На Пакровы дай сена карове». Дзякуючы фанетычнай сугучнасці свята Пакрова сабрала шмат прыкмет і парадаў, звязаных з каровамі: «Прыйшла Пакроўка — не дала малака кароўка» (г. зн. запускаецца) або — у дачыненні да нерухавага гаспадара: «Хто сее на Пакрове — не будзе мець чаго даць карове». Пакроў лічыўся надзейным паказчыкам прагнозаў надвор'я на даволі аддаленыя дні і нават на цэлыя поры года: «Калі да Пакрова дня снег не пакрые зямлю, то і на Каляды не будзе снегу»; «Якое надвор'е ў дзень Пакрова, такое яно і будзе ўсю зіму да вясны»; «Калі да Пакроў не было снегу, не будзе яго яшчэ дзве нядзелі»; «Калі ад Пакроў да свята Усіх Святых (1 лістапада) краты зямлю точаць, то зіма будзе снежна і марозліва». Асабліва пільна сачылі на Пакрова за напрамкам ветру: з якога боку ён быў у гэты дзень, з таго боку ён павінен дзьмуць галоўным чынам і ў бліжэйшую зіму. Зыходзячы з таго пераканання, што поўдзень заўсёды нясе цяпло, а поўнач — холад, сцвярджалі, што паўночны пакроўскі вецер прадказвае суровую зіму, а паўднёвы — мяккую, гнілую. Калі ж з раніцы задзьме ўсходні вецер — зіма будзе маласнежная, заходні — наадварот, вельмі снежная.

Наступала пара восеньскіх вяселляў. У народзе казалі: «Ад Пакрова ўжо дзеўка гатова». З марамі пра замужжа дзяўчаты прасілі святы Пакроў пакрыць іх галаву вянком (чапцом): «Пакравы прыйдуць — дзеўцы галаву накрыюць». Калі ж вяселле на гэты раз абмінала хату, то «Праходзіць Пакрова — раве дзеўка, бы карова».

**14—21 кастрычніка**. Тыдзень пасля Пакрова. У некаторых мясцінах Беларусі называўся «дзявоцкае лета» ў адрозненне ад «бабінага». Усе дні размяркоўвалі між дзеўкамі і дзяўчынкамі, якіх ужо прынялі «ў дзеўкі», і варажылі пра добры характар будучых маладух. Калі дні стаялі пагодныя, сонечныя, значыць, і характар у дзяўчат павінен быць людскі, ласкавы. Далікатныя абмеркаванні і размовы змушалі дзяўчат, якім не зашкодзіць, удумліва глянуць на сябе і на свой нораў.

**31 кастрычніка**. Дзень Лукі, называлі яшчэ прысвяткам іканапісцаў. Паўсюль спраўляліся восеньскія вяселлі, шчаслівыя сваты задаволена канстатавалі: «На Лукаша — дзеўка наша». Адзначаны ў той жа дзень Юльян лічыўся захавальнікам малых дзяцей.

# Займальны матэрыял








# Папулярызацыя беларускай мовы

Калейдаскоп
кастрычнік 2022

### Свята паэзіі «З Купалам у сэрцы жывём»

**6 кастрычніка** ў межах «Адзінага дня беларускага маўлення» ў **7 «Б»** класе адбылося свята паэзіі **«З Купалам у сэрцы жывём».** Вучні выразна чыталі вершы, урыўкі з паэм беларускага паэта Я. Купалы. Пясняр з’явіўся на свет 140 гадоў назад, але напісанае ім актуальна і сёння. Радасна, што мерапрыемства, прысвечанае роднай мове, пакінула светлы след у душы кожнага.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т.М.**






# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**кастрычнік 2022**

### Гульня «Восень-чарадзейка»

**13 кастрычніка** ў рамках беларускамоўнага чацвярга ў школьнай бібліятэцы адбылася **гульня «Восень-чарадзейка».**

У ходзе мерапрыемства школьнікі чыталі і абмяркоўвалі вершы пра восень: В. Вярбы “Восень”, Я. Купалы “Лістапад”, П. Броўкі “Надыход восені”. Дзеці ўдзельнічалі ў конкурсах “Прыбяры ўраджай”, “Колеры восені”, “З якога дрэва лісток”, адгадвалі загадкі, успаміналі народныя прыкметы пра восень.

Мерапрыемства прайшло цікава, займальна і пазнавальна.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Маргунова В. В.**






# Юбілейныя даты






**Іван Мікалаевіч Пташнікаў** — беларускі пісьменнік. Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1983). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа (1978) за аповесць «Найдорф».

Нарадзіўся 7 кастрычніка ў вёсцы Задроздзе Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Скончыўшы ў 1951 годзе Плешчаніцкую беларускую сярэднюю школу, Пташнікаў паступіў у Беларускі тэатральны інстытут на акцёра. Але не вучыўся, вярнуўся дамоў. У 1952 годзе паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Скончыў у 1957 годзе. Працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР (1957-1958), часопісах «Маладосць» (1958-1962), «Полымя» (1962-1995).

У 1957 годзе, калі Іван Пташнікаў быў яшчэ студэнтам апошняга курса, у часопісе «Полымя» была надрукавана аповесць «Чачык». Менавіта з гэтай аповесці пачынаецца яго творчая біяграфія. Пасля з’яўляюцца іншыя новыя творы пісьменніка. Яны склалі першую кнігу апавяданняў і аповесцей «Зерне падае не на камень» (1959).

Асаблівае месца ў творах Івана Пташнікава займае тэма вайны. Апавяданні «Алёшка», «Алені», «Бежанка», «Эфка» пра падлеткаў, якія сталелі ў выпрабаваннях вайны і першых пасляваенных гадоў. У аснову аповесці «Тартак» (1967) пакладзены канкрэтны фактычны матэрыял: трагічны лёс вёскі Дальва, якая была спалена фашыстамі разам з людзьмі за сувязь яе жыхароў з партызанамі. Паводле сцэнарыя аўтара ў 1973 годзе зняты аднайменны фільм на Беларускім тэлебачанні. Аповесць «Найдорф» (1975, Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа ў 1978 годзе) прысвечана апошнім дням, нават гадзінам вайны, вайны партызанскай, і першым дням міру на гэтай зямлі. Тэма беларускай вёскі 1960-80-х гадоў, духоўны свет селяніна-працаўніка, яго сувязь з зямлёю і прыродай адлюстравана ў раманах «Мсціжы» (1970) і «Алімпіяда» (1985).

У 2005 годзе І. Пташнікаў перажыў інсульт, пасля гэтага не мог сам хадзіць і з дому яго выводзілі толькі ў шпіталь. Меў творчыя задумы, даваў інтэрв’ю, але, з уласных словаў, не меў сіл пісаць. Памёр 28 ліпеня 2016 года ў сваёй кватэры ў Мінску. Пахаваны на Паўночных могілках Мінска.

# Юбілейныя даты






**Леанід Васільевіч Дранько-Майсюк** — беларускі паэт, празаік, публіцыст. Член Саюза пісьменнікаў СССР (1984 ). Лаўрэат прэміі «Залаты апостраф» (за нізку апавяданняў у часопісе “Дзеяслоў” (2005).

Нарадзіўся 10 кастрычніка 1957 года ў працоўнай сям’і ў горадзе Давыд-Гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Нарадзіўся ў рабочай сям’і. Дзед — Мікалай Дранько, яўрэйскага паходжання, працаваў шаўцом у арцелях у Давыд-Гарадку. Мясцовыя жыхары звалі паміж сабой Мікалая таксама яшчэ і Майсюк. Яго сына Васіля (бацька Леаніда, нар. у 1931 г.) запісалі ў царкоўную кнігу Дранько-Майсюком па мянушцы бацькі. Пасля вайны, калі выпісвалі савецкія дакументы на падставе царкоўных запісаў, Васілю выдалі пасведчанне аб нараджэнні з прозвішчам Дранько-Майсюк. Леанід Дранько-Майсюк скончыў Давыд-Гарадоцкую СШ № 2 (1974), працаваў на Давыд-Гарадоцкім заводзе слясарна-мантажных інструментаў. У 1975 г. паступіў на завочнае аддзяленне паэзіі Літаратурнага інстытута ў Маскве. У 1976—1978 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі перавёўся на стацыянарнае аддзяленне Літінстытута, які скончыў у 1982 г. У гэты перыяд (у 1980 г.) пазнаёміўся з будучай жонкай, масквічкай Вольгай. У 1982—2002 гг. — рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Са жніўня 2002 г. — на вольнай працы.

Дэбютаваў вершамі ў столінскай раённай газеце «Навіны Палесся» ў 1972 г., у рэспубліканскім друку ў 1975 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар 16 кніг, у тым ліку зборнікаў паэзіі «Вандроўнік» (1983), «Над пляцам» (1986), «Тут» (вершы, паэмы, эсэ, 1990), «Пра тое, як я…» (13 несур’ёзных апавяданняў, 1992), «Акропаль» (паэзія, эсэ, 1994), «Стомленасць Парыжам» (вершы і эсэ, 1995), «Месца і свет» (вершы, 2000), «Паэтаграфічны раман» (вершы, проза, 2002), «Вершы. Каханне. Проза» (выбранае, 2003), «Белая вежа» (разам з Юрыем Кабанковым; вершы, лісты; Уладзівасток, 2004), «Цацачная крама» (кніжка для вялікіх і малых, 2008), «Анёлак і я» (апавяданне, 2009), «Кніга для спадарыні Эл» (проза, вершы, п’еса, 2012), “…Натуральны, як лінія небасхілу” (архіўная аповесць пра Максіма Танка, Мінск, “Кнігазбор”, 2017). Асобныя вершы Л. Дранько-Майсюка пакладзены на музыку.

# Літаратурная старонка

Калейдаскоп
кастрычнік 2022

## Восень, восень залатая

Восень, восень залатая
Сее радасць на зямлі,
Хмарка ў сінім небе тае,
Мкнуць у вырай жураўлі.
Ніткай срэбнай павуцінне
Ў косах сонейка блішчыць.
Што за цуднае зіхценне!
Што за ціш вакол стаіць!
Я іду лясною сцежкай,
Як па мяккім дыване.
Восень з ветлівай усмешкай
На спатканне выйшла мне.
Ярка, хараша прыбрала
Ўсюды дрэвы і кусты
І зямлю памалявала
Ў колер жоўта-залаты.
С. Новік-Пяюн



# Цікава ведаць





# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**кастрычнік 2022**






**Рэдактар Юрчанка С.А.**